шчылінах бані» (запісана ад Дземідок Марыі Іванаўны, 1941 г. н.). Вышэйпрыведзеныя звесткі па персанажах ніжэйшай міфалогіі – яскравы доказ багацця праяў фантастычнасці міфалагічных уяўленняў мясцовых жыхароў.

Пашчасціла запісаць асобныя звесткі і пра міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з дрэвамі. У мясцовых павер'ях самым шчаслівым дрэвам лічылася бяроза. Як паведаміла Ціханчук Любоў Мікалаеўна, 1936 г. н., гэта дрэва патрэбна было пасадзіць каля той хаты, якую пабудавалі для маладой сям'і: «Штоб былі грошы і здароўе, дак нада пасадзіць бярозу маладым, калі тыя прыехалі ў новую хату». Калі жанчына памірала, дык «у малітве ўсягда ету жэншчыну называлі бярозай» (ад Рудабелец Васіліны Канстанцінаўны, 1928 г. н.). У народнай міфалогіі дрэвам, якое сімвалізавала хуткі рост, здароўе, жыццёвую сілу, урадлівасць, з'яўляецца вярба. Галінкі вярбы пасля асвячэння ў царкве, абавязкова патрэбна было пакласці на покуць, а таксама «пасцёбаць» хатнюю жывёлу і членаў сям'і, каб усе былі здаровыя: «У нядзелю перад Паскай хадзілі свяціць вярбу. Пасля свячэння прыходзілі дадому і сцёбалі ўсё жывое, штоб былі здаровенькія і крэпенькія на працягу года» (запісана ад Рудабелец Таццяны Васільеўны, 1957 г. н.). Сімвалам мужчынскай сілы быў дуб. Паводле аповеду Пімінёнкавай Паліны Міхайлаўны, 1981 г. н., маладая жанчына, калі была цяжарная і хацела нарадзіць хлопчыка, павінна была тры разы абняць дуб і набрацца мужчынскай сілы: «Еслі маладая жэншчына хацела радзіць хлопца, то нада ісці да дуба і абняць яго тры разы. Тады набіраецца цела мужчынскай сілы і моцы».

Надзвычай цікавымі з'яўляюцца міфалагічныя вераванні, звязаныя з рэчыўным светам. Мясцовыя жыхары раілі не выкідваць валасы «з грэбня, бо калі выкінуць, то будзе балець галава», тлумачылі, чаму нельга «шчытаць грошы пасля заходу сонца (бо тады не будуць весціся)», чаму нельга класці нож на голы стол («бо будуць сваркі ў сям'і»), чаму нельга сядзець на стале («бо замуж дзеўка не выйдзя») (запісана ад Пімінёнкавай Паліны Міхайлаўны, 1981 г. н.).

Міфалагічныя звесткі, запісаныя на тэрыторыі вёскі Аляксееўка Брагінскага раёна Гомельскай вобласці, сведчаць пра захаванне рэшткаў архаічных уяўленняў у памяці вяскоўцаў, гутаркі з якімі пераканалі, што і сёння яны актыўна звяртаюцца ў жыцці і побыце да спрадвечнай народнай мудрасці.

**Літаратура**

1 Зямная дарога ў вырай: беларускія народныя прыкметы і павер'і: у 3 кн. / уклад., прадм., пер. і паказ. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1999. – Кн. 3 – 654 с.

**УДК 398.51(476.2-37Рагачоў)**

***М. П. Саўкова***

# ТРАДЫЦЫІ ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ РАГАЧОЎСКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Артыкул прысвечаны даследаванню мясцовай спецыфікі вясельнай абраднасці ў Рагачоўскім раёне Гомельскай вобласці і грунтуецца на ўласных палявых экспедыцыйных запісах, зробленых у вёсках Ільіч, Званец і Шапчыцы. Характарызуючы асобныя этапы мясцовага вясельнага абрадавага комплексу, аўтар засяроджвае ўвагу на адметных для вышэйназваных мясцовасцей лакальных асаблівасцях, якія яскрава выяўляюцца ў асобных рытуалах, прыкметах і павер'ях.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Беларусы з вялікай пашанай адносяцца да такога маляўнічага абраду ў сістэме сямейна-абрадавай паэзіі, як вяселле. У параўнанні з іншымі відамі сямейнай абраднасці, гэты від мастацтва структурна больш складаны. Прыемна адзначыць, што сёння, у дваццаць першым стагоддзі, моладзь імкнецца да арганізацыі свайго шлюбу згодна з традыцыямі нашых продкаў. Важна памятаць, што народная духоўная культура – гэта арганічная часцінка нашага жыцця і актуальнасць захаваных у шматлікіх пакаленнях традыцый вясельнай абраднасці відавочная. Змест розных фальклорна-этнаграфічных зборнікаў, звязаных з вяселлем, пераконвае, што ў кожнай мясцовасці яно мае свае адметныя рысы, захоўваючы пры гэтым агульныя абрадавыя этапы і звязаныя з імі рытуалы.

Яркім і самабытным з’яўляецца вясельны абрад аднаго з раёнаў Гомельскай вобласці – Рагачоўскага, у структуры якога можна вылучыць тры традыцыйныя часткі: перадвясельную, уласна вясельную і паслявясельную.

Да перадвясельнага перыяду адносяцца пярэпыты, запоіны і заручыны, аднак у сувязі з тым, што інфармацыя страчваецца, адбываецца блытаніна тэрмінаў. Іншы раз інфарманты аб’ядноўваюць усе гэтыя этапы ў межах якога-небудзь аднаго абрадавага этапу, напрыклад, сватання або заручын. Сватанне – гэта прадуманы крок перш за ўсё з боку жаніха. Тым не менш яно заўсёды заключала ў сабе нейкі момант нечаканасці, непрадказальнасці, магчыма, нават непрыемнай адмовы альбо з боку бацькоў нявесты, альбо ад яе самой. Звычайна дзяўчына не ведала, хто і калі прыедзе да яе ў сваты: «Неяк тады не гаварылі, калі прыедуць, як уздумаецца, так і ехалі. Прыедуць, быстра стол накрыем і знакоміліся ўжо» (запісана ў в. Званец ад Здрэставай Ганны Палікарпаўны, 1947 г. н.). Не выпадкова да гэтага этапу бацькі жаніха ставіліся з усёй адказнасцю, старанна выбіраючы час сяброўскага візіту і тых людзей, якія ў ім будуць прымаць удзел. Як паказвае практыка, у сваты бралі самых блізкіх: «Прыехаў да мяне жаніх на кані з бацькам родным, хросным, мамай, хросная мама была, друг яго і дзядзька» (запісана ў в. Ільіч ад Саўковай Веры Тарасаўны, 1932 г. н.).

Сваты на гасцінцы былі не прагныя, у большасці выпадкаў прывозілі з сабой пачастункі. Галоўным гасцінцам быў абрадавы хлеб – каравай, які меў спецыфічную функцыянальнасць. Калі дзяўчына і яе бацькі былі згодны на шлюб, маці абменьваліся «сваімі караваямі»: «Прывезлі з сабой бусла (вялікая бутэлька гарэлкі: 4 літры), яйкі, сала, пеўня ды каравай. Потым караваямі маткі абменьваліся, значыць, усё добра прайшло і начыналі гатовіцца да свадзьбы» (запісана ў в. Ільіч ад Саўковай Надзеі Тарасаўны, 1930 г. н.).

З боку нявесты рыхтавалі для сватоў падарункі, у якасці якіх выкарыстоўвалі ручнікі. Імі потым і перавязвалі сватоў: «Сватам у нас дарылі вышаваныя рушнікі. Прышлі ка мне, а мама ўжо глядзіць, што бацьку рушнік нада падвязаць, матцы тожа нада даць, ну, і сватоў падвязаць. Калі не было ўжо рушнікоў, тады падвязвалі платочкамі, былі яны сіццавыя» (запісана ў в. Шапчыцы ад Самусевай Дар’і Максімаўны, 1929 г. н.).

Можна сказаць, што сватанне мела ў пэўнай ступені тэатральны характар. Часцей за ўсё гутарка ў сватах вялася ў іншасказальнай форме, ніхто не выдаваў прамога намеру. Сваты прыкідваліся, што заблудзіліся або прыехалі па тавар: «Мы прыехалі, прывезлі вам красного молодца, а вы нам пакажыце красную дзевку. Ездзілі, ездзілі, чуць нашлі!» (запісана ў в. Гарадзец ад Кірылюк Марыі Карлаўны, 1926 г. н.) [1, с. 373].

Варта адзначыць, што абрадавы момант сватання суправаджаўся шматлікімі лакальнымі прыкметамі і павер’ямі. Жыхары Рагачоўскага раёна ўлічвалі некалькі часавых фактараў, якія маглі паспрыяць і паўплываць на лёс маладых. Напрыклад, Самусева Дар’я Максімаўна, 1929 г. н., сцвярджае, што ў сваты звычайна прыходзілі ў нядзелю і пажадана «ў дні з няцотнымі лікамі»: «Прыйшлі ка мне ў сваты ў васкрасенне. У той час абязацельна хадзілі ў васкрасенне. Шчэ гаварылі, што добра было, калі ў нячотныя числа, тады маладыя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

жыць будуць шчасліва» (запісана ў в. Шапчыцы ад Самусевай Дар'і Максімаўны, 1929 г. н.). Важным момантам з'яўлялася насыпанне збожжа ў бутэльку. Жыхары Рагачоўскага раёна захоўваюць гэты старажытны элемент, які меў месца падчас сватання: «У канцы ўжо мама нявесты насыпала ў бутылку зярно і давала свату. Зярно азначала жызнь маладых. Тады гаварылі, што гэта зярно прарасце новым коласам» (запісана ў в. Ільіч ад Саўковай Веры Тарасаўны, 1932 г. н.). Варта адзначыць, што перададзеная бутэлька з зернем сватам сімвалізавала таксама і згоду на шлюб.

Паколькі сватанне ўяўляла сабой своеасаблівую дамову маладых і сваякоў, то важна было атрымаць згоду на шлюб з абодвух бакоў. Вялікай рэдкасцю была адмова з боку дзяўчыны, але ў жыццёвай практыцы іншы раз гэта можна было сустрэць, што суправаджалася адпаведнымі дзеяннямі: «Калі маладая была не сагласна выхадзіць за хлопца, тады вешалі на забор дзіравы кошык. Магла дзеўка вынесці на лаўку гарбуз» (запісана ў в. Шапчыцы ад Самусевай Дар'і Максімаўны, 1929 г. н.). Калі згода на шлюб была атрымана, маладыя пачыналі падрыхтоўку да вяселля, якое хутка павінна было адбыцца: «Вось прыйшлі да мяне ў васкрасенне ў сваты, а цераз два васкрасення –свадзьба, у трэцяе палучаецца» (запісана ў в. Шапчыцы ад Самусевай Дар'і Максімаўны, 1929 г. н.).

Першым этапам уласна вясельнай часткі лічылася выпечка каравая, з якой і пачыналася само вяселле. Вясельны каравай займаў надзвычай важнае месца ў традыцыйным вясельным абрадзе беларусаў. Шматлікія працоўныя дзеянні, звязаныя з падрыхтоўкай каравая, выконваліся святочна, урачыста, паколькі лічылася, што гэты атрыбут вяселля – сімвал бласлаўлення маладых, пажадання ім дабрабыту.

Падчас вясельнай цырымоніі звычайна пяклі два караваі: адзін – у нявесты, другі – у жаніха. За якасць каравая заўсёды несла адказнасць хрышчоная маці. Жыхарка вёскі Ільіч Саўкова Надзея Тарасаўна, 1930 г. н., пераканана ў тым, што каравай насычаўся сілай таго чалавека, які яго вырабляў, таму адказнасць за такую складаную працу і ўскладалася на плечы хроснай маці, аднак абавязковай умовай з'яўлялася наяўнасць у яе мужа, шчаслівы лёс: «Было абязацельна 2 караваі. Адзін пяклі ў нявесты (яе хросная мама), а другі ўжо пяклі ў жаніха (яго хросная мама). У нас тады неяк верылі, што толькі ў хросных лёгкая рука і каравай палучыцца добрым. Калі ўжо каравай добры, тады і жызнь маладых такой будзе. Толькі не давалі каравай дзелаць, еслі у хроснай маткі не было мужыка ці жыла яна плоха» (запісана ў в. Ільіч ад Саўковай Надзеі Тарасаўны, 1930 г. н.). Жыхары Рагачоўскага раёна захоўвалі веру ў тое, што ў гэтай справе дапаможа малітва, таму звычайна, замешваючы цеста, прамаўлялі яе: «Хросныя ўсегда садзіліся на каленкі і доўга чыталі малітву. Ад ўсёй душы прасілі Бога, каб памог зрабіць караваі пышнымі і красівымі» (запісана ў в. Ільіч ад Саўковай Надзеі Тарасаўны, 1930 г. н.).

З асаблівым хваляваннем чакалі канца прыгатавання вясельнага хлеба. Гэтаму ёсць сваё тлумачэнне. Калі каравай вымалі з печы, вельмі асцерагаліся з'яўлення расколін на каравае, бо існавала павер'е, што такі негатыўны вынік працы сімвалізаваў разлад у жыцці маладых: «Вось калі трэшчыны былі на каравае, тады гаварылі, што доўга ўмесце жыць не будуць» (запісана ў в. Ільіч ад Саўковай Веры Тарасаўны, 1932 г. н.). Такім чынам, выпяканне вясельнага каравая, якое суправаджалася многімі рытуаламі, смела можна назваць надзвычай важным абрадавым этапам.

Найбольш яскравай мясцовай спецыфікай вясельнай абраднасці Рагачоўскага раёна з'яўляецца абавязковы абрад запрашэння памерлых бацькоў, які выконваўся напярэдадні вяселля. Сутнасць яго заключалася ў тым, каб сімвалічна запрасіць бацькоў, якія ўжо адышлі, на вяселле: «Калі не было бацькі ці маткі, ці саўсем сірата, тады перад свадзьбай шлі па сялу на клодаўе зваць іх» (запісана ў в. Шапчыцы ад Самусевай Дар'і Максімаўны, 1929 г. н.). Рытуал «буджэння памерлых» суправаджаўся шэрагам незвычайных дзеянняў: «Калі ідзеш на клодаўе і людзі стаяць на вуліцы, ты даўжна падысці і кланяцца ім усім. Яны пытаюць у цябе: "Куды ты ідзеш?", а ты адказваеш: "Іду

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

на клодаўе маму будзіць”. Як адкажыш, тады яны ўжо цябе благаслаўляюць, перахрэшчваюць» (запісана ў в. Шапчыцы ад Самусевай Дар’і Максімаўны, 1929 г. н.).

Устойліва захаваліся ў памяці Самусевай Дар’і Максімаўны, 1929 г. н. і звесткі, звязаныя з дзеяннямі менавіта на могілках памерлых: «Калі на клодаўе прыходзіш, запальваеш свечку, ставіш у стакан з зярном. Пасля гэтага гукаеш маму: “Мама, мама, устань, сёння мой рашаюшчый дзень, прыхадзі на свадзьбу, благаславі мяне”. Як ужо пагукаеш, цалуеш тры разы крэст і зямлю, кланяешся. Назад ідзеш, тожа нада кланяцца людзям, еслі не бачыла іх. Яны цябе як бы замест мамы на жыццё благаслаўляюць» (запісана ў в. Шапчыцы ад Самусевай Дар’і Максімаўны, 1929 г. н.). Увесь працэс і ўчынкі, якія былі скіраваны на запрашэнне памерлых бацькоў, выконваліся нездарма, мелі вельмі кранальны і глыбокі сэнс, звязаны былі, хоць і апасродкавана, з пажаданнем долі дачцэ.

У сістэме вясельнай абраднасці адметнае месца адводзілася і такому абрадаваму моманту, як «зборам нявесты», асабліва калі гэта адбывалася ў чужой хаце. Напрыклад, паводле сведчанняў Самусевай Дар’і Максімаўны, 1929 г. н., хата, у якой адбыліся няшчасныя выпадкі, мела негатыўную энергетыку, што ў будучым магло паўплываць на лёс маладых: «У сваёй хаце гаварылі няльзя, наражалі ў чужой. Хату выбіралі харошую, штоб там харошыя людзі жылі. А ў такой хаце, дзе быў пажар, памёр хтосьці ці жыла ўдава, нельзя было – дужа плахая прымета: дзеўка магла такую судзьбу паўтарыць» (запісана ў в. Шапчыцы ад Самусевай Дар’і Максімаўны, 1929 г. н.).

Асаблівай ўвагі заслугоўвае сам убор нявесты. Цікавымі з’яўляюцца звесткі, якія сведчаць аб тым, што вопратка маладой залежала і ад сацыяльнага статусу яе сям’і: «Тады нарадаў такіх не было. Калі радзіцелі багатыя былі, маглі пашыць маевае плацце (рэдзенькая ткань, як павуцінка), а калі бяднейшыя, тады ў сацінавым плацці выходзілі» (запісана ў в. Шапчыцы ад Самусевай Дар’і Максімаўны, 1929 г. н.).

Нашы продкі ставіліся да падрыхтоўкі ўбору вельмі адказна, паколькі лічылі, што ён валодае вялікай засцерагальнай функцыяй. З мэтай абараніць ад злых намераў будучае маладых жыхары Рагачоўскага раёна дзейнічалі згодна з устаноўленымі правіламі: «Плацце цвяцістае быць должно с краснымі цвятамі, тады гаварылі: ніхто зглазіць не мог. Шчэ каб не зглазілі, клалі ў тухлі лісце рабіны ці чаплялі пад плацце дзеўкі» (запісана ў в. Шапчыцы ад Самусевай Дар’і Максімаўны, 1929 г. н.).

Калі ўсё было падрыхтавана да правядзення вяселля, пачыналася святкаванне самога шлюбу. Вяселле ў вёсках гулялі звычайна некалькі дзён: «Свадзьбу гулялі ў нас тры дні. Першы – у нявесты, другі – у жаніха, на трэці ўжо ў родзічаў розных» (запісана ў в. Ільіч ад Саўковай Веры Тарасаўны, 1932 г. н.).

Па сведчаннях інфармантаў, першы дзень пачынаўся з прыезду маладога па маладую. Выкуп нявесты нагадваў нейкую тэатральную пастанову і меў звычайна жартоўны характар: «Калі малады прыязджае за маладой, ён доўжан яе выкупіць. Маладая хаваецца, а ў маладога трэбуюць бутылкі, канфеты, грошы. Маладому падсоўваюць старых пераадзетых баб. Калі ён дае добры выкуп, тады яму аддаюць маладую» (запісана ў в. Гарадзец ад Кірылюк Марыі Карлаўны, 1926 г. н.) [1, с. 371].

У структуры рагачоўскага вяселля вылучаецца і такі абрадавы момант, як пасад. Пасад маладых – адзін з найважнейшых абрадаў традыцыйнага беларускага вяселля. Выконваўся ён таксама ў першы дзень вяселля. Вылучалі два тыпы абрадавага этапу «пасад». Па-першае, пасад маладой перад ад’ездам да маладога: «Стаяў стол, на стале ікона ляжала. Бацька хросны абвязваў сваю руку і маю рушніком, вадзіў тройчы вакруг стала. Потым ужо ты даўжна стаць на вярстак і пацалаваць ікону тры разы» (запісана ў в. Шапчыцы ад Самусевай Дар’і Максімаўны, 1929 г. н.). Па-другое, сумесны пасад маладых у хаце маладога: «Калі прыезджалі ўжо к жаніху, яго радзіцелі засцялалі слон кажухом і мы садзіліся на поўсць гэту, каб жыць багата» (запісана ў в. Ільіч ад Саўковай Веры Тарасаўны, 1932 г. н.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Асобнай гаворкі заслугоўвае звычай перагароджваць дарогу маладым падчас іх ад'езду да хаты маладога, які меў спецыфічную мясцовую назву «барада». Сутнасць заключалася ў тым, што людзі, якія былі сведкамі вяселля, перагароджвалі дарогу, нацягваючы нітку, з мэтай атрымаць выкуп: «Калі ўжо ехалі ў хату к жаніху, людзі нам нацягвалі нітку цераз дарогу і як бы не пускалі, тады жаніх даваў ім гасцінцы, а яны гэтую нітку убіралі. Такое называлася барада ў нас» (запісана ў в. Ільіч ад Саўковай Веры Тарасаўны, 1932 г. н.).

Кульмінацыйным момантам на вяселлі была дзяльба каравая, пры гэтым падзел каравая адбываўся як у хаце маладой, так і ў хаце маладога: «Той каравай, што пяклі ў нявесты, дзялілі яе госці, а тады ехалі к жаніху і ўжо там дзялілі яго госці» (запісана ў в. Ільіч ад Саўковай Надзеі Тарасаўны, 1930 г. н.). Калі дзялілі каравай, то спачатку першыя яго кавалкі давалі маладым і назіралі за тым, хто які кавалак адкусіў, бо лічылася, што такім чынам можна было вызначыць галоўнага ў сям'і: «Во калі каравай кусалі, тады глядзелі ўжо, хто большы кусок адкусіў, той будзе верх мець ў сям'і» (запісана ў в. Ільіч ад Саўковай Веры Тарасаўны, 1932 г. н.).

Як дэманструюць уласныя запісы звестак, паслявясельная частка Рагачоўскага раёна мела такія назвы, як «банкеты» і «вадзіць пярэзву»: «Пасля самой свадзьбы, калі другія родзічы звалі к сабе, такі абрад называлі банкеты ў нас» (запісана ў в. Ільіч ад Саўковай Веры Тарасаўны, 1932 г. н.); «Бацька хросны вёў перазву, гэта значыць, калі скончылася свадзьба, то тады ён вядзе к сабе дамоў ўсіх гэтых гасцей» (запісана ў в. Шапчыцы ад Самусевай Дар'і Максімаўны, 1929 г. н.).

Такім чынам, вяселле ў вёсках Рагачоўскага раёна вылучаецца адметнымі лакальнымі асаблівасцямі, якія выяўляюцца на розных абрадавых этапах.

**Літаратура**

1 Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік / рэд. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Мінск: ЛМФ "Нёман", 2003. – 472 с.

**УДК 811.161.1'42'373.2:177.9:821.161.1-1/-2*А. П. Сумароков**

***А. В. Самойленко***

## КОНЦЕПТ «*ХИТРОСТЬ*» В БАСНЯХ А. П. СУМАРОКОВА

*Статья посвящена анализу концепта «хитрость» и его функционированию в басенном творчестве А. П. Сумарокова. В результате работы выявлены следующие объекты сатиры: корыстолюбивые судьи, спесивые дворяне, невежественные помещики, богатые и нечестные купцы и торговцы, злые дворянские жены, глупые и завистливые люди. Частотными проявлениями указанных аспектов явились аллегорические образы различных животных, которые совершают те или иные действия, поступки: кошка, лисица и др.*

В последнее время в лингвистике всё более актуальными становятся проблемы когнитивно-коммуникативного аспекта изучения языка. Этими проблемами занимаются такие современные лингвисты, как Д. С. Лихачев, С. А. Аскольдов-Алексеев, В. С. Адамова, В. З. Демьянков, Е. С. Кубрякова, И. В. Бурдин, Н. В. Аввакумова и др.

В филологии концепт – это «содержательная сторона словесного знака, за которой стоит понятие, относящееся к умственной, духовной или материальной сфере

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ